■ Увага: віктарына!

# «ЗВЯЗДА» ЯК ПАДРУЧНІК

**Сёлета Беларусь адзначае 70-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтая дата адметная і для «Звязды» — газеты-падпольшчыцы, газеты-партызанкі, якая прайшла праз ваеннае ліхалецце разам са сваімі чытачамі.**

**Напярэдадні свята прапануем вам, шаноўныя чытачы, узгадаць некаторыя падзеі і факты з гісторыі газеты — а па вялікім рахунку, і роднай краіны. Самыя памятлівыя, уважлівыя і дасведчаныя ўдзельнікі кожнага тура рэдакцыйнай віктарыны будуць адзначаны прызамі ад рэдакцыі. Сёння, дарэчы, стартуе першы тур, а ўсяго іх будзе некалькі. Падвядзенне ж вынікаў віктарыны плануецца ў жніўні, напярэдадні дня нараджэння «Звязды». Адказы на пытанні першага тура з пазнакай «Віктарына» прымаюцца на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А) і электронны адрас (info@zvyazda.minsk.by) рэдакцыі па 26 чэрвеня.**

## «Гісторыя газеты — гісторыя краіны»

**1 На якой сталічнай вуліцы ўсталяваны помнік «Звяздзе»?**
— праспект Незалежнасці
— вуліца Кульман
— вуліца Багдановіча
— праспект газеты «Звязда»

**2 Як звалі жанчыну, у хаце якой друкавалася падпольная «Звязда»?**
— Альбіна
— Марфа
— Галіна
— Марыя

**3 У якім годзе быў адкрыты мемарыял «Востраў Зыслаў» на месцы, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны амаль 1,5 года знаходзіўся падпольны абкам партыі, партызанскі аэрадром і друкарня некалькіх газет?**
— 1950 г.
— 2001 г.
— 1969 г.
— 1984 г.

**4 Дзе і калі падчас Вялікай Айчыннай вайны ўбачыў свет апошні нумар «легальнай» «Звязды»?**
— 21 чэрвеня 1941 г. у Мінску
— 3 студзеня 1942 г. у Магілёве
— 13 жніўня 1941 г. у Гомелі

**5 Адзін з гэтых людзей не з'яўляўся рэдактарам «Звязды» падчас Вялікай Айчыннай вайны. Хто?**
— Мікалай Дзялец
— Уладзімір Амельянюк
— Міхаіл Барашкаў
— Ядзвіга Савіцкая
— Вячаслаў Нікіфараў

**6 Дзе і калі быў надрукаваны першы нумар падпольнай «Звязды»?**
— 23 ліпеня 1942 г. у Любанскім раёне
— 30 снежня 1941 г. у Мінску
— 18 мая 1942 г. у Мінску
— 23 лютага 1942 г. у Маскве

**7 Таму, хто ўкажа, дзе друкуецца «Звязда», фашысцкія акупацыйныя ўлады абвясцілі ўзнагароду...**
— 300 рублёў
— 20 тысяч марак і карову
— 10 тысяч марак
— 75 тысяч марак

**8 Якія дзяржаўныя ўзнагароды мае «Звязда»?**
— Ордэн Леніна
— Ордэн Чырвонай Зоркі
— Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені і ордэн Багдана Хмяльніцкага
— Ордэн Айчыннай вайны I ступені і ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга

**9 Іменем першага рэдактара падпольнай «Звязды» Уладзіміра Амельянюка не толькі названы вуліцы ў Мінску і родным пасёлку Дно Пскоўскай вобласці — яго вобраз увекавечаны ў кіно. Як называецца гэты фільм?**
— «Дзяўчынка шукае бацьку»
— «Руіны страляюць»
— «Рэпартаж з лініі агню»
— «Балада пра салдата»

**10 Як вы мяркуеце, што за канструкцыя на здымку?**



■ Роздум пісьменніка

# ПЛАСТМАСА



Днямі мяне «заклініла». З-за смецця, якое пачалі ўжо кідаць і на вуліцах. А больш дакладна — пластмасы. Але пачну здалёк.

Гадоў дваццаць таму па журналісцкіх справах я праязджаў праз адну нашу вёску. Не буду называць яе, бо не ведаю, як яна цяпер. На маіх вачах там адбываўся самасуд. Судзілі праезджага вадзіцеля (побач — шаша), які збочыў да мясцовай сажалкі і выкінуў туды нейкае смецце. Увязненага прымусілі вылавіць смецце з вады і пасля ў выхаваўчых мэтах, па парадзе вясковых старэйшын, надавалі яму ў пысу і добрых выспяткаў.

— У нас таму і парадак, — давялі мясцовыя, — што мы самі за ім сочым. І нікому не дазволім быць быдлам.

У вялікай дагледжанай сажалцы боўтала рыба, смела праплыла непалоханая выдра. «Самі азярцо выкапалі, — патлумачылі мне. — Прыстойнаму чалавеку і палавіць дазволім — тут карасі па кілаграме на гачок лезуць. Мы не жлабы».

Нобелеўскі лаўрэат па літаратуры Іва Андрыч любіў масты і шмат апісваў іх у сваіх творах. Часта наведваючы Барысаў, у межах якога працякаюць тры рэчкі і існуюць аж пяць мастоў, я ўспамінаю замілаванне вялікага баснійца перад рэкамі і мастамі. Аўтамабільны мост цераз знакамітую Бярэзіну сімвалічна дзеліць горад на стары і новы. Побач з асноўнай дзяржаўнай магістраллю, літаральна за год, тут адбудаваны тры супермаркеты, раней вырас мікрараён. З моста відаць і яшчэ адно дзіва — вялізны, у некалькі квадратных кіламетраў, вадаём.

Здалёк усё прыгожа — дрэвы, водная роўнядзь, вузкая паласа малой ракі Сха, якая праз гэты вадаём, які тут называюць Земснарад, упадае ў Бярэзіну. Чвэрць стагоддзя таму тут пачалі будаваць зону адпачынку: размылі і паглыбілі пойму Схі. Але надышлі «хвацкія 1990-я», жалезныя баржы ўтапілі, будаўнікі зніклі. Нягледзячы на ўсё гэта, Земснарад застаўся. Назіраць за яго лёсам цяпер ужо небяспечна для нервовай сістэмы. Таксама, як і за лёсам дзвюх рэчак, якія павінны толькі ўпрыгожваць горад. У якім, дарэчы, горадзе (лічы, у яго цэнтры) можна ўбачыць такое жыватворнае спалучэнне? Вадаём і дзве ракі?

Але...

Берагам Схі, зарослай вербалозам, бруднай, гібеючай, іду да Земснарада. Бачу бясконцыя груды пластыкавых бутэлек, скарыстаных разавых талерак і відэльцаў, пакеты, зноў пакеты, упакоўкі з-пад яек і ёгуртаў, пластыкавыя шклянкі, сляды ад вогнішчаў і зноў бутэлькі — пластыкавыя і шкляныя. Апошнія дзе здолелі — білі на асколкі, а калі не маглі, а так карцела, то, пэўна, у істэрыцы лупілі іх аб зямлю. Інакш адпачынак — не ў радасць.

Шмат дрэў звалілася ў раку. Там, дзе яны ствараюць затор, своеасаблівую гаць, — горы бруднага, зацвілага пластыку: пакеты, бутэлькі. Гэта тое, што мы бачым зверху. Пра тое, што на дне, лепш не думаць. Яшчэ горшая, лічы, жудасная карціна на берагах Земснарада. Тут бясконцыя сляды баляванняў — усё той жа пластык, аб'едкі, недакуркі, пачкі ад цыгарэт, фольга, старыя чаравікі, зношаныя майкі, скарыстаныя шпрыцы, пакеты... Увесь гэты набор у вадзе ля берага і далей. У цёплыя дні (пад'езд да вадаёма чамусьці не забаронены) тут чароды машын, многія вязуць ужо з сабой водныя скутары. А на вадаёме — сапраўдная вакханалія: маторкі, скутары, плывучы рэстаранчык — усё гэта раве, брыдкасловіць, кідае ў ваду адходы.

Тое ж на берагах Бярэзіны. Плывуць адна за адной пластыкавыя бутэлькі, смецце. Смецце ляціць у рэкі з мастоў. Асабліва жудасна глядзець на гэта ўзімку: на лёдзе — горы адходаў спажывання.

У чалавека ў генах, пэўна, закладзена жаданне адпачыць душой і целам менавіта ля вады, на беразе ракі, возера і г.д. Калі ж ён зноў і зноў пакідае тут пасля сябе звалку і зноў жа п'е, гікае і спявае тут у чарговы адпачынак — дык ці чалавек ён? А можа — скот?

Можа, за часы камуністычнай утопіі, бязмернага п'янства, жыцця па хлусні, замбіравання тэлебачаннем чалавек канчаткова дэградаваў? Можа, пачалася яго інвалюцыя і ён праз нейкі час ператворыцца ў малпу?

Больш як стагоддзе таму бельгійскі хімік Леа Хендрык Бэкеланд у сваім гаражы ў Нью-Ёрку (ён жыў у Амерыцы) атрымаў першую, поўнасцю сінтэтычную пластмасу. У 1922 г. нямецкі хімік Герман Штаўдынгер (нобелеўскі лаўрэат 1953 г.) вызначыў малекулярную структуру пластмасы. Неўзабаве пачалася вытворчасць сілікону. І пайшло: з'явіліся акрыл, паралон, паліфен, поліўрэтан і г.д.

Пластмаса практычна не раскладаецца. Нават тонкі харчовы пакет — за 400 гадоў. Паліць? Атрымаем так званыя дыяксіны — для чалавека гэта смяротная небяспека.

У самым канцы мінулага стагоддзя была вынайдзена «Вялікая Пластыкавая Юшка». Амерыканскі яхтсмен Чарлз Мур на катамаране «Алкаліта» плыў праз Ціхі акіян у маладаследаваным яго раёне. Цэлы тыдзень на яго вачах плавалі кавалкі пластыку, зубныя шчоткі, бутэлькі, пакеты і г.д. Капітан Мур жахнуўся. Праз два гады ён (думкі не давалі спакою) вярнуўся і зрабіў сенсацыйнае адкрыццё. На глыбіні 10 метраў была суцэльная пластыкавая юшка. На кожны квадратны кіламетр да 100 тысяч пластыкавых фрагментаў! Да праблемы падключыліся «грынпісаўцы». Вір, у якім пластыку ў 100 разоў больш, чым у сярэднім аказаўся большы за тэрыторыю ЗША! А дно акіяна? Там збіраецца да 70% марскога пластыкавага смецця. Уся «юшка» «важыць», па падліках вучоных, больш як 120 мільёнаў тон. А гэта — самае страшнае забруджванне, якое зведала планета.

Футуролагі-аптымісты лічаць, напрыклад, што працягласць жыцця любой разумнай цывілізацыі — каля 3 тысяч гадоў, адлічваючы ад пачатку работы першага радыёперадатчыка. Песімісты, такія, як французскі акіянолаг Ж. Кусто, — нашмат менш. Па яго прагнозах, чалавецтва можа пачаць марудна альбо імкліва гінуць ужо дзесьці ў 2050 годзе.

Усе рэкі цякуць у моры і акіяны. Усе яны таксама нясуць туды пластмасу. Асабліва шмат смеццевых адходаў сплывае з афрыканскага кантынента. І не толькі вувузел...

Але ж вернемся да нашых мясцовых балючых пытанняў, да нашых лясоў, рэк і азёраў — бо менавіта тут наша багацце, якому няма цаны.

Іду праз пешаходны масток цераз Бярэзіну. Тут штодня віруе моладзь. На парэнчах панавешаны замкнёныя замкі і замочкі — маладажоны кідаюць ключы ад іх у ваду — на шчасце. А вечарам туды ж ляцяць пластыкавыя пакеты і бутэлькі ад піва. Унізе, на бетонным падмурку — выява ўльтраправых і іх заклік: «Не кідайце смецця». І далей: «Прырода, Радзіма, Народ». На жаль, гэта, як кажуць, адзінокія галасы ў пустэчы. Угаворы і заклікі не дапамагаюць.

Два аўтамабільныя масты цераз раку Сха ў яшчэ горшым стане, бо ўнізе ўсё тое ж пластыкавае смецце, а рэчышча загароджана паваленымі дрэвамі і ўсялякім брудам. А яшчэ сорак гадоў таму тут сплаўлялі лес.

Лічу, надышоў час і ў нас прымаць сур'ёзныя захады. Вызначыцца з заканадаўствам. Бо нават распрацаваная сістэма штрафаў не працуе. У Сінгапуры варта плюнуць на тратуар, а не тое што недакурак кінуць — і атрымай $1000 штрафу. А вось нашы некаторыя параметры: распальванне вогнішчаў у забароненых месцах — 12 базавых велічынь; забруджванне — 20 б.в.; смецце — 2 б.в. і г.д.

Ужо цяпер на тым жа Земснарадзе, куды на глыбіню да 12 м заходзіць рыба, варта, на мой погляд, увесці платную сістэму. З кожнага рыбалова — 1 умоўная адзінка ў дзень. Заплаціў — і сядзі спакойна, лаві сваё шчасце.

За месяц гэта будзе сума прыкладна ў 2 тысячы ўмоўных адзінак. На палавіну яе можна наняць пару чалавек — адміністратара і рабочага, каб збіраць грошы і выдаляць смецце. І штрафаваць бязлітасна, бо толькі скот не разумее таго, што ён творыць, а так, можа, да яго і дойдзе. Будзе і нейкі даход дзяржаве, і, адначасова, ахова прыроды.

А пакуль тут усё па-ранейшаму. Пластыкавы бруд, аб'едкі, маторныя лодкі (дарэчы, адна з іх штогод пад расійскім сцяжком), дзікія п'яныя гіканне і посвіст. А год таму сюды прарвала і гарадскую каналізацыю. Страшна за дзяцей-байдарачнікаў мясцовай спартыўнай школы, якія трэніруюцца на вадаёме, бо бяда (не дай Бог) прыходзіць нечакана.

Дадам, што па самай ажыўленай трасе рэспублікі, якая праходзіць побач, штодня праязджаюць дзясяткі тысяч машын. Сярод іх ёсць і замежнікі. Іншыя з іх спыняюцца альбо збочваюць да вадаёма (уезд жа па-ранейшаму не забаронены), і тут перад іх вачыма і паўстае вышэйапісаная карціна.

Мэрыі, таварыству ахову прыроды (ці існуе яно тут увогуле?), міліцыі трэба ўжо прымаць адпаведныя захады і навесці парадак.

Можна зразумець гарадскія ўлады: у іх іншых клопатаў хапае. Але захаваць твар і адпаведную рэпутацыю рэгіёна — іх прамы абавязак. Дый зазірнём у недалёкую будучыню і будзем шчырымі: абставіны ў сувязі з усё больш частымі прыроднымі і тэхнагеннымі катаклізмамі пагаршаюцца ва ўсім свеце. Насплявае нешта нядобрае. І тое, што нам воляй лёсу дастаўся не самы горшы кавалак зямлі (тысячы азёраў, рэчак і крыніц, лясы, пушчы і запаведнікі), — усё гэта варта берагчы да апошняга, хоць бы для нашых нашчадкаў, — і самай жорсткай, нават іншым разам далёка не папулярнай цаной.

**Юрый СТАНКЕВІЧ**

■ Вяртанне на радзіму

## СПАДЧЫНУ КРАШЭЎСКАГА ПРЭЗЕНТАВАЛІ НА «РУЖАНСКАЙ БРАМЕ»

**Чацвёрты раз у Ружанах адсвяткавалі фэст «Ружанская брама». Былі, як заўсёды, тэатралізаваны паказ, цікавая канцэртная праграма, кірмаш рамеснікаў і народных майстроў, народныя гулянні з гандлёвымі радамі, а таксама традыцыйны ўжо вячэрні феерверк.**

Але яшчэ на першай «Браме» дамовіліся, што фестываль будзе мець абавязковы інтэлектуальны складнік. На гэты раз да свята прымеркавалі выхад электроннай версіі твораў пісьменніка Юзафа Крашэўскага. У многіх крыніцах Юзаф Ігнацы Крашэўскі падаецца, як польскі пісьменнік. Але пружанцы нездарма лічаць яго сваім, бо нарадзіўся вядомы чалавек у мястэчку Доўгае ў сям'і пружанскага харунжага. І правёў тут не толькі сваё маленства, але жыў некаторы час і дарослым. Яшчэ гісторык, грамадскі дзеяч, мастак і кампазітар Крашэўскі праславіўся тым, што напісаў каля 600 тамоў мастацкіх, дакументальных, публіцыстычных твораў. За такую неверагодную працаздольнасць пісьменнік занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Гэта яму прыпісваюць выраз «Ні дня без радка». Многія яго творы былі напісаны на матэрыяле малой радзімы.

Віртуальная рэканструкцыя выбраных твораў Юзафа Крашэўскага стала інтэрнацыянальным праектам. Над ёй шчыравалі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Горкага, Ровенскай абласной бібліятэкі, бібліятэкі польскага горада Бяла-Падляска і музея Юзафа Крашэўскага ў Раманаве (ваколіца Бялай-Падляскі). Два дыскі ўмясцілі ў сябе самыя цікавыя творы аўтара, бібліяграфію, а таксама яго музыку, жывапіс. Літаратурная спадчына пісьменніка даецца на беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай мовах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

Белинвестбанк

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.**

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 972 952,8 | 938 440,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 793,9 | 4 771,9 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 830 274,1 | 2 722 420,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 137 193,0 | 777 879,2 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 057 954,8 | 3 145 393,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 16 101 885,1 | 15 012 882,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 835 850,8 | 799 700,8 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | 77 973,7 | 78 419,1 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 915,1 | 1 915,1 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 735 575,2 | 1 700 595,5 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 1 096,8 | 1 094,0 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | | 234 695,4 | 277 555,0 |
| 16 | **ИТОГО активы** | **11** | | **25 992 160,7** | **25 461 067,6** |
| 17 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | | 447 209,5 | 1 188 159,6 |
| 19 | Средства банков | 1202 | | 3 366 866,8 | 2 798 733,8 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | | 17 454 108,6 | 16 818 587,8 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 1 027 085,4 | 1 039 247,1 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | | 469 711,3 | 441 685,9 |
| 24 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **22 764 981,6** | **22 286 414,2** |
| 25 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 1 167 408,3 | 1 167 408,4 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,1 | 0,1 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 115 929,9 | 115 842,6 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 1 147 517,6 | 1 148 302,5 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 795 737,4 | 742 655,0 |
| 31 | ВСЕГО капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 3 226 593,3 | 3 174 208,6 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 585,8 | 444,8 |
| 33 | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **3 227 179,1** | **3 174 653,4** |
| 34 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **25 992 160,7** | **25 461 067,6** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.**

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 824 690,9 | 628 476,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 647 400,8 | 489 132,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 177 290,1 | 139 343,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 168 709,1 | 134 265,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 28 735,5 | 25 660,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 139 973,6 | 108 605,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 77,5 | 157,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 7 124,0 | 1 566,7 |
| 9 | Чистый доход от операций с иностранной валютой | 205 | | 10 088,9 | 39 025,2 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 36 150,0 | (4 086,0) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 38 204,6 | (845,4) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 47 700,4 | 27 869,6 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 295 006,6 | 211 612,2 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 27 010,7 | 29 936,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 58 182,6 | 71 778,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 4 231,9 | 9 049,8 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **53 950,7** | **62 729,0** |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 302,8 | (475,3) |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | **Итого прибыль (убыток)** | | | **54 253,5** | **62 253,7** |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 54 112,6 | 62 163,6 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 140,9 | 90,1 |

**И.о. председателя Правления** **А.В. Сокирко**

**Главный бухгалтер** **А.Н. Сырокваш**

Консолидированный отчет ОАО «Белинвестбанк» размещен на официальном сайте банка – **http://www.belinvestbank.by/bank-profile/key_performance_indicators/nsfo/quarterly_report_belinvestbank/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3 выдана Национальным банком Республики Беларусь 3 июня 2013 г.

146 КОНТАКТ-ЦЕНТР

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, УНП 807000028

**www.belinvestbank.by**

# ГАНАРЫЦЦА МІНУЛЫМ — БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэтыя сімвалічныя даты сталі нагодай для сур'ёзных дыскусій і разважанняў. Невыпадкова ў Нацыянальнай акадэміі навук пры падтрымцы Міністэрства абароны адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: памятнае лета 1944 года». Навукоўцы, архівісты, грамадскія дзеячы з Беларусі, Расіі і Польшчы, а таксама прадстаўнікі сілавых ведамстваў, ветэраны вайны, студэнты і курсанты вышэйшых навучальных устаноў краіны сабраліся ў беларускай сталіцы. Прыбылі і дэлегацыі Азербайджана, Арменіі, Таджыкістана і Туркменістана, ваенныя аташэ іншых краін.

— У жыццё ўступае новае пакаленне, — зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль ТОЗІК.** — І яно не павінна забывацца, што гісторыя — гэта палітыка, павернутая назад. Без ведання гісторыі не можа быць патрыёта. Без ведання мінулага, без беражлівага стаўлення да яго ў краіне не можа быць добрай будучыні. Таму такія мерапрыемствы асабліва важныя для моладзі. Асабліва калі сёння многія спрабуюць збіць з панталыку новае пакаленне, скажаючы гісторыю, спрабуючы перабудаваць яе пад свае амбіцыі. А нам не трэба нічога перабудоўваць. Нам проста неабходна памятаць, як усё было. Вядома, гэта тычыцца не толькі Вялікай Айчыннай вайны. Беларусам у сваёй тысячагадовай гісторыі саромецца няма чаго: мы на ўсіх яе этапах паводзілі сябе годна. Гэта трэба ведаць, гэтым трэба ганарыцца. Будзем ганарыцца мінулым — будзем паспяхова будаваць сваю будучыню.

На канферэнцыі падрабязна аналізавалася падрыхтоўка і ход Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі, якая з'яўляецца адной з найбольш выдатных не толькі ў Вялікай Айчыннай, а і ва ўсёй Другой сусветнай вайне. Абмяркоўваліся важнейшыя праблемы ў інтэрпрэтацыі і асвятленні мінулых падзей. Яшчэ раз падкрэслівалася вялікая роля партызанскага руху і падпольнай барацьбы на акупаванай тэрыторыі, адзначалася савецкае вайсковае мастацтва ў перыяд вызвалення Беларусі. Не засталіся без увагі і пытанні захавання, перадачы агульнай гістарычнай памяці.

— Няма другой такой рэспублікі ў былым Савецкім Саюзе, народ якой больш пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны, — пераканаты **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН.** — На постсавецкай прасторы і ва ўсім свеце я не бачу падобных прыкладаў беражлівых адносін да памяці народа. У нашай краіне праводзяцца шматлікія мерапрыемствы, а сёлета адкрываецца і новы музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Колькі ў нас абеліскаў, дагледжаных брацкіх магіл, пахаванняў невядомых салдат, — усё сведчыць аб народнай памяці. Прыняўшы гэтую эстафету ў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, мы павінны перадаць яе сваім дзецям, унукам і праўнукам. Дзеля таго, каб для іх гэтая вайна не была чужой, каб яны не ўспрымалі яе як аддаленую гістарычную падзею, суперажывалі, ведалі добра гісторыю і разумелі, што зрабілі іх прадзеды, каб яны шчасліва жылі ў свабоднай краіне.

Міністр абароны агучыў новую ініцыятыву беларускага ваеннага ведамства аб стварэнні народнага помніка «Салдатам 41-га».

— У нас вельмі шмат помнікаў, абеліскаў і стэл на тэрыторыі краіны, — патлумачыў Юрый Жадобін. — У асноўным усе яны прысвечаны вызваленню краіны ці тым падзеям, якія адбываліся ў партызанскім і падпольным руху. Ёсць невялікія барэльефы на Брэсцкай крэпасці і шэрагу іншых будынкаў, усталяваныя ў памяць салдатам і камандзірам 1941 года. Але мне здаецца, што мы мала аддалі даніну памяці тым, хто загінуў у першыя дні і тыдні вайны. Невыпадкова сёння распрацоўваецца пытанне аб стварэнні помніка «Салдатам 41-га». На мой погляд, было б правільна, каб ён з'явіўся ў раёне Ваўкавыска — Ружанаў — Слоніма, дзе савецкія войскі 3-й і 10-й армій на працягу двух дзён вялі жорсткія баі з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Як расказваюць ветэраны, гэты ўчастак называлі «дарогай смерці»: тут загінула вялікая колькасць чырвонаармейцаў. Такім чынам у нас з'явіцца магчымасць аддаць даніну памяці ўсім байцам і камандзірам 41-га, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі і заклалі аснову нашай Перамогі.

Як падкрэсліў **старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ,** для беларусаў тэма Вялікай Айчыннай вайны заўсёды будзе актуальнай. «Пастаянна адкрываюцца новыя факты, праводзяцца новыя даследаванні, якія патрабуюць абагульнення і сістэматызацыі, каб нам было што пакінуць сваім нашчадкам», — паведаміў акадэмік.

У гэтым можна было пераканацца падчас выставы, арганізаванай у акадэміі. Вялікая колькасць даследаванняў, шматлікая літаратура. Сёння ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук створаны спецыяльны аддзел, прысвечаны гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які якраз і займаецца новымі распрацоўкамі. Дарэчы, многія вучоныя ўстановы ў гады вайны абаранялі краіну са зброяй у руках, большасць з іх дамоў так і не вярнулася. Вельмі доўга потым давялося аднаўляць гэты патэнцыял. За гады вайны гітлераўцы разбурылі будынак, ад якога засталіся толькі калоны. Былі разрабаваны навуковыя фонды, бібліятэка. Усё прыйшлося пачынаць з пачатку. І сёння можна смела казаць, што больш ніякая іншая ўстанова краіны не праводзіць столькі даследаванняў па тэме апошняй вайны, не выдае столькі тэматычнай літаратуры. Прычым фундаментальнай, заснаванай на дакументах, на фактах.

**Для беларусаў тэма Вялікай Айчыннай вайны заўсёды будзе актуальнай. Пастаянна адкрываюцца новыя факты, праводзяцца новыя даследаванні.**

Немалы ўклад у захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ўносяць і дзяржаўныя архівы краіны. Менавіта яны ахвотна дзеляцца з навукоўцамі новымі звесткамі, каб яны сталі вядомымі шырокай аўдыторыі.

— Сёння ў дзяржаўных архівах Беларусі на пастаянным захаванні знаходзіцца каля 13 мільёнаў спраў — з 1391 года і да сённяшняга часу, — расказаў **дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі Уладзімір АДАМУШКА.** — Гэта вялікая гістарычная спадчына, якую мае не кожная краіна свету. Значны масіў дакументальнай інфармацыі адносіцца да гісторыі войнаў. Большую частку складаюць звесткі перыяду Вялікай Айчыннай вайны: каля 400 тысяч спраў, з якіх звыш 250 тысяч адзінак на папяровых і больш 100 — на аўдыявізуальных носьбітах. Таксама ў нас ёсць імянная картатэка на ўсіх удзельнікаў партызанскага руху і падполля на тэрыторыі Беларусі, якая змяшчае звыш 400 тысяч персаналій.

Дзяржаўнымі архівамі выпускаецца ў свет вялікая колькасць зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, рэалізуюцца шматлікія выставачныя праекты, прысвечаныя гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У межах выдавецкай і экспазіцыйнай дзейнасці адкрываюцца малавядомыя і нават невядомыя старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у навуковы зварот уводзяцца новыя дакументы. За апошнія 20 гадоў дзяржаўнымі архівамі краіны створана 69 зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, а таксама даведачных выданняў, прысвечаных Другой сусветнай вайне. Пагадзіцеся, немалая лічба для нашай рэспублікі.

Пра тое, што праводзіць такія мерапрыемствы, як навукова-практычная канферэнцыя, лепш з удзелам замежных спецыялістаў, выказаліся ўсе ўдзельнікі форуму.

— Трэба, каб у нас быў адзіны погляд на гэтую тэму, бо вайна — з'ява складаная ў грамадска-палітычных адносінах, — патлумачыў **прэзідэнт Акадэміі ваенных навук Расійскай Федэрацыі генерал арміі ў адстаўцы Махмут ГАРЭЕЎ.** — Прычым больш актуальнай тэмы ўжо не бывае. Многія высновы і ўрокі з Беларускай аперацыі маюць значэнне і для цяперашняга дня. Пры яе планаванні і правядзенні была праяўлена вялікая творчасць і хітрасць. «Баграціён» — найбольш павучальная і выдатная аперацыя, якая характарызуе савецкае ваеннае мастацтва не толькі часоў Вялікай Айчыннай вайны, а і Другой сусветнай, у якой ніколі не позна вучыцца.

Як прызнаўся **ваенны аташэ Рэспублікі В'етнам Нгуен Ба ХІЕН,** для іх вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — таксама свята. «Мы нешта падобнае праходзілі, толькі нашымі ворагамі былі амерыканцы, — расказаў старшы палкоўнік. — У нас так кажуць: закрыем, але не забудзем мінулае. Усё часцей назіраюцца спробы перапісаць гісторыю. Мы не дадзім! Таму правядзенне падобных канферэнцый будзе дарэчы не толькі ў выпадках святкавання пэўных юбілеяў, а ўвогуле без усялякіх дат: сістэматычна і рэгулярна. Мы павінны не толькі нагадваць аб сваім мінулым, а і выхоўваць на яго аснове патрыятызм, гонар за сваіх продкаў, каб моладзь не забыла іх подзвіг».

Мяркуем, што наступны год стане багатым на шматлікія навуковыя канферэнцыі, культурна-асветніцкія і іншыя праграмы. І хоць яны будуць прымеркаваныя да святкавання юбілею Вялікай Перамогі, гэта стане добрай нагодай для працягу традыцый, абмеркавання сумесных праектаў, якія будуць ажыццяўляцца на міжнароднай арэне ўжо пасля такіх знакавых дат.

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.